# Адбылося пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага (экспертнага) савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Мінсувязі

22 лістапада пад старшынствам Міністра сувязі і інфарматызацыі Папкова С.П. адбылося пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага (экспертнага) савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

У пасяджэнні прынялі ўдзел Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Рыбак Андрэй Анатольевіч, начальнікі структурных падраздзяленняў Мінсувязі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў «Інфармацыйнае грамадства», Тэлекамунікацыйнага галіновага саюза, асацыяцыі «Белінфакам», кіраўнікі ЗАТ «Тэхніка і камунікацыі», РУП «Белтэлекам», ЗАТ «НАША ПОЧТА», СТАА «Беларускія хмарныя тэхналогіі», РУП «Нацыянальны цэнтр абмену трафікам», аператараў сотавай рухомай электрасувязі.

У рамках пасяджэння разгледжаны пытанні якасці паслуг сувязі, якія прадстаўляюцца на тэрыторыі рэспублікі, прававыя аспекты ў рамках аказання паслуг аператарамі сувязі. Таксама абмеркаваны пытанні экспертызы праектаў, якія рэалізуюцца ў рамках праграм міжнароднага супрацоўніцтва ў інфармацыйнай сферы.

**Source URL:** *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/22-11-2017-2506*